УДК 373.3.035.6

***Д.А. Субат,***
*УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна”,*
*Мазыр, Рэспубліка Беларусь*

# РОЛЯ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў ПРАЦЭСЕ ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНИКАЎ

*Анатацыя. Артыкул прысвечаны актуальнай на сённяшні дзень праблеме фарміравання нацыянальнай самасвядомасці вучня першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі, дзе асаблівая ўвага надаецца мастацкай літаратуры як сродку фарміравання асобы малодшага школьніка. Праведзены аналіз навучальнага дапаможніка для малодшых школьнікаў, а таксама вызначаны ўплыў мастацкіх твораў на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці вучняў.*

*Ключавыя словы: нацыянальная самасвядомасць, мастацкая літаратура, малодшы школьнік, менталітэт, літаратурнае чытанне, падручнік.*

***D.A. Subat***
*Mozyr State Pedagogical University named after I.P. Shamyakin*
*Mozyr, Republic of Belarus*

# THE ROLE OF ARTISTIC LITERATURE IN THE PROCESS OF FORMING NATIONAL CONSCIOUSNESS OF YOUNGER SCHOOL STUDENTS

*Abstract. The article is devoted to the currently relevant problem of forming the national self-awareness of students of the first level of general secondary education. Special attention is paid to fiction, as a means of forming the personality of a junior high school student. The scientific novelty consists in the analysis of the study guide for younger schoolchildren, as well as the determination of the influence of artistic works on the formation of national self-awareness of students.*

*Keywords: national self-awareness, fiction, junior high school student, mentality, literary reading, textbook.*

МГПУ им. И.П. Шамякина

Паняцце “нацыянальная самасвядомасць” стала ўводзіцца ў навуковыя даследаванні, найперш этнаграфічнай тэматыкі, з 60-х гадоў XX ст. З сярэдзіны 80-х гадоў з'яўляюцца працы навукоўцаў, прысвечаныя праблеме нацыянальнай самасвядомасці ў кантэксце вывучэння тэорыі этнасу. У іх нацыянальная самасвядомасць тлумачылася, як разуменне людзьмі сваёй прыналежнасці да пэўнай супольнасці, што валодае шэрагам характарыстык у адрозненне ад іншых народнасцей. Нацыянальная самасвядомасць узнікае пераважна ў выніку далучэння асобы да самабытнай культуры, мовы, менталітэту. Варта адзначыць, што гэтая самасвядомасць узнікае не адразу, а развіваецца паступова, у працэсе этнагенезу і з'яўляецца адной з ключавых характарыстык кожнага этнасу.

У сучасных умовах, калі ўзрастае ўплыў глабалізацыйных працэсаў, развіццё нацыянальнай самасвядомасці выступае адным з тых галоўных кірункаў педагагічнай працы, рэалізацыя якіх скіравана на фарміраванне, развіццё і ўкараненне ідэй, якія спрыяюць адзінству народа і забяспечваюць кансалідацыю і гуманітарную бяспеку грамадства [1, с. 77].

Менавіта ў малодшым школьным узросце ажыццяўляецца актыўны працэс назапашвання ведаў вучнямі аб жыцці грамадства, гісторыі і культуры народа, узаемаадносін паміж людзьмі, складваецца тая інфармацыйная база, якая служыць падмуркам нацыянальнага самаўсведамлення.

Школьныя прадметы, якія вывучаюцца на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі, акрамя свайго пазнавальнага зместу, выконваюць функцыю далучэння асобы дзіцяці да цывілізацыйнай культуры.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу пытанню фарміравання нацыянальнай самасвядомасці надаецца значная ўвага. У нарматыўна-прававых дакументах, якія вызначаюць змест навучання на першай ступені атрымання агульнай сярэдняй адукацыі, нацыянальная самасвядомасць разглядаецца як адна з галоўных выхаваўчых задач.

Кодэкс аб адукацыі Рэспублікі Беларусь вызначае ў якасці мэты выхавання фарміраванне рознабакова развітай, маральна сталай, творчай асобы навучэнца. Дадзеная мэта прадугледжвае вырашэнне шэрагу задач, першая з якіх патрабуе “фарміраваць грамадзянскасць, патрыятызм і нацыянальную самасвядомасць на аснове дзяржаўнай ідэалогіі” [2].

Прыярытэтнае значэнне задачы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці паслядоўна захоўваецца ў нарматыўна-прававых дакументах, якія акрэсліваюць змест і арганізацыю адукацыйнага працэсу.

Так, у Рэспубліцы Беларусь распрацавана Канцэпцыя бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнцаў [3], якая вызначае сутнасць і асноўныя напрамкі выхавання падрастаючага пакалення. Дадзены дакумент замацоўвае наступныя прыярытэты выхавання ва ўстановах адукацыі: паслядоўнае і актыўнае садзеянне асобаснаму станаўленню грамадзяніна і патрыёта сваей краіны, прафесіянала-працаўніка, адказнага сем'яніна.

Асабліва значнымі ў гэтым працэсе бачацца гуманітарныя прадметы і найперш мастацкая літаратура.

Фарміраванне каштоўнасных арыентацый сродкамі літаратуры ўяўляе складаны выхаваўчы працэс, вынік якога залежыць ад узроўню развіцця пачуццёва-эмацыйнай сферы вучняў і псіхолага-педагагічных умоў успрымання мастацкага твора.

У пачатковых класах знаёмства дзяцей з мастацкімі творамі адбываецца ў асноўным у рамках вывучэння прадмета “Літаратурнае чытанне”.

Выхаванне нацыянальнай самасвядомасці ў значнай ступені грунтуецца на засваенні зместу твораў нацыянальнага мастацкага слова. Літаратура ў цэлым – гэта адзін са спосабаў спазнаць свет, чалавецтва, самога сябе. Мастацтва слова



МГПУ им. И. П. Шамякина

перадае думкі, погляды, стаўленне да жыцця, рэчаіснасці не толькі асобнага аўтара, але і той супольнасці, якую ён прадстаўляе.

Асабліва значную калектыўную светапоглядную аснову маюць фальклорныя творы, якія адлюстроўваюць у тым ліку і народны педагагічны вопыт. Народная педагогіка выкарыстоўвае легенды і быліны, найбагацейшы фальклор, рытуальнасць і абрадавасць, народныя гульні і святы, увасабляе ў сабе здабытак рамёстваў і мастацтва, выпрацаваныя стагоддзямі прылады і прыёмы працы, паводзіны, нацыянальны характар і шмат чаго іншага.

Разам з тым, варта адзначыць, што пытанне фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ў малодшых школьнікаў асабліва важна для школ, у якіх руская мова навучання з’яўляецца асноўнай, таму што дзеці ў такіх школах радзей сустракаюцца з беларускай мовай, якая з’яўляецца значным фактарам у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці.

Мы праводзілі аналіз зместу падручніка па літаратурным чытанні для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі пад рэдакцыяй М.В. Жуковіч [4; 5] у кантэксце праблемы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. У дадзеным падручніку дзеці знаёмяцца з творамі, якія адлюстроўваюць адносіны да роднай зямлі, Радзімы і хлеба, да народных сімвалаў Беларусі і нацыянальнай культуры нашага народа.

Першы раздзел другой часткі падручніка напоўнены творамі беларускага фальклору: казкамі, калыханкамі, забаўлянкамі, пацешкамі. Гэты матэрыял адыгрывае важную ролю ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці ў навучэнцаў на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі. За кошт матэрыялу, які размешчаны ў падручніку, вучні знаёмяцца з гісторыяй краіны і адначасова ўзмацняюць пачуццё гонару за Беларусь.

Вялікая роля ў падручніку надаецца патрыятычнаму выхаванню вучняў. Гэта відаць па колькасці твораў, накіраваных на выхаванне пачуцця любові да Радзімы, напрыклад, Міхась Пазнякоў “Помнік герою”, Алесь Махнач “Юныя абаронцы”, Міхась Даніленка “Ордэн”.

Змест падручніка знаёміць таксама з культурай іншых народаў – гэта самы лепшы шлях да выхавання павагі, сімпатыі, добрых пачуццяў да людзей іншых нацыянальнасцей і этыкі міжнацыянальных зносін, што асабліва актуальна ў наш час. Літаратура дапамагае сфарміраваць у дзяцей эмацыянальна-станоўчыя адносіны да факту існавання розных народаў, моў, культур, зразумець, што свет цудоўны ў разнастайнасці, і сустрэча з любой культурай дорыць радасць адкрыццяў. Пра чалавека мяркуюць не па колеры скуры і валасоў, а па яго справах і ўчынках.

У паэтычных вобразах мастацкая літаратура адкрывае і тлумачыць дзіцяці жыццё грамадства і прыроды, свет чалавечых пачуццяў і ўзаемаадносін. Яна ўзбагачае эмоцыі, выхоўвае ўяўленне і дае дзіцяці выдатныя ўзоры беларускай літаратурнай мовы. Мастацкія творы дазваляюць вучням на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі не толькі пазнаваць мінулае, але і перажываць яго разам з героямі, фарміраваць погляды, пачуцці, характар. Мастацкія творы абуджаюць любоў да прыгожага, выхоўваюць гатоўнасць да барацьбы за ўрачыстасць дабра і праўды, знаёмяць з асаблівасцямі жыцця народа. Задача літаратуры – данесці да дзяцей думку, што яны і Беларусь – адно цэлае. Аб сваім абавязку перад маці і Радзімай трэба памятаць з дзяцінства, абудзіць у душы і сэрцы павагу да іх. Пры вывучэнні мастацкіх твораў адбываецца ўсведамленне дзецьмі маральных каштоўнасцей.

Па словах беларускага навукоўца П.Р. Кошмана, “значэнне мастацкай літаратуры ў жыцці грамадства абумоўлена ў многім тым, што яна валодае

МГПУ им. И.П. Шамякина

здольнасцю яднаць разрозненую людскую масу ў супольнасць. Вобразы, сюжэты, героі, аўтары і іх біяграфіі – ва ўвесь гэты літаратурны рыштунак… закладзена своеасаблівая ідэнтыфікацыйная праграма, якая вызначае варыянты атаясамлівання асобы з пэўнай рэлігіяй, тэрыторыяй, палітычнай ідэалогіяй і іншымі агульнымі сэнсамі існавання соцыуму” [6].

Такім чынам, перад сістэмай адукацыі стаіць задача далучэння новых пакаленняў навучэнцаў да гістарычнай памяці народа, да ведаў звычаяў і традыцый, роднай мовы. Таму мэта працы педагогаў на працягу ўсіх чатырох гадоў пачатковай школы – накіроўваць дзейнасць навучэнцаў на вывучэнне гісторыі і культуры роднага краю. Для дасягнення гэтай мэты добрым матэрыялам могуць паслужыць сродкі мастацкай літаратуры, паколькі яна з'яўляецца своеасаблівым летапісам чалавечага грамадства, магутнай прыладай чалавечай культуры, выдатным сродкам выхавання маладога пакалення, а таксама памочнікам у фарміраванні пачуцця нацыянальнай самасвядомасці.

*Спіс крыніц:*

1. Палиева, Т.В. Периодизация генезиса поликультурного дошкольного образования в Беларуси / Т.В. Палиева // Весн. Мазыр. дзярж. пед. ун-та імя І.П. Шамякіна. Педагогіка. – 2020. – № 1 (55). – С. 76–82.
2. Об изменении Кодекса Республики Беларусь об образовании [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь от 14.01.2022 № 154-З. – Режим доступа : https://ilex-private.ilex.by/view-document/BELAW/177587/#M100011. – Дата доступа : 12.05.2022.
3. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2021–2025 годы : [утв. постановлением М-ва образования Респ. Беларусь 31.12.2020, № 312] // Зб. нармат. дак. М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – 2021. – № 7 (крас.). – С. 3–50.
4. Літаратурнае чытанне : вучэбны дапаможнік для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання : у 2 ч. Ч. 1 / М.В. Жуковіч. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2019. – 136 с.
5. Літаратурнае чытанне : вучэбны дапаможнік для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання : у 2 ч. Ч. 2 / М.В. Жуковіч. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2019. – 120 с.
6. Кошман, П.Р. Фармат увасаблення мастацкага слова / П.Р. Кошман // Беларуская думка. – 2017. – № 11. – С. 99–103.

МГПУ им. И.П. Шамякина